# ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

УДК 821.161.2-3

## КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ НЕАРАМАНТЫЗМУ Ў БЕЛАРУСКАЙ І ЎКРАІНСКАЙ ЛІТАРАТУРАХ ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

*І.А. ВОРАН*
*(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)*

*Даследуецца неарамантызм як мастацка-эстэтычны напрамак канца XIX – пачатку XX стагоддзя, які найбольш поўна адлюстраваў філасофска-псіхалагічную атмасферу дадзенага перыяду ў славянскай культуры. Шырокае ўжыванне тэрміна «неарамантызм» украінскімі і беларускімі крытыкамі тлумачыцца іх спробай падкрэсліць спецыфіку славянскага мадэрнізму, акцэнтаваць увагу на яго рамантычнай дамінанце, а таксама на яго дыферэнцыраванасці адносна класічнага заходнееўрапейскага мадэрнізму і дыстанцыянаванасці адносна дэкадансу, які атрымаў негатыўную ацэнку ў гэтых літаратурах. Найбольш выразна канцэптуалізацыя ўкраінскага неарамантызму адлюстравана ў літаратурна-крытычных артыкулах Л. Украінкі, у якіх аналізуецца прырода дадзенага напрамку, разглядаюцца яго агульныя тэндэнцыі ў межах агульнаеўрапейскага літаратурнага працэсу, а таксама асаблівасці іх праяўлення ва ўкраінскай літаратуры. Неарамантызм А. Луцкевіч акрэслівае як агульнае найменне мадэрністычных плыняў, якія мелі месца ў беларускай літаратуры, і паказвае яго галоўную рысу – пераемнасць, захаванне традыцыі. Значнае месца ў літаратурна-крытычных артыкулах Л. Украінкі і А. Луцкевіча займае канцэптуалізацыя неарамантычнага героя.*

**Уводзіны.** Для ўкраінскай і беларускай літаратур пачатак XX стагоддзя стаў часам актыўных пошукаў уласнага шляху развіцця, імкнення рэпрэзентаваць нацыянальную літаратуру ў каардынатах агульнаеўрапейскага працэсу як арганічнай часткі славянскага свету, сцвярджаючы яе як самабытны, самадастатковы ў сваім развіцці геакультурны феномен. Нягледзячы на рознасць грамадска-палітычных, культурнагістарычных кантэкстаў, літаратуры канца XIX – пачатку XX стагоддзя аб'ядноўвае агульная філасофскапсіхалагічная атмасфера эпохі з яе апакаліптычным светаадчуваннем, унутранай разарванасцю чалавека паміж патрэбай захавання сваёй першаіснасці і навязанымі цывілізацыяй сацыяльнымі «ролямі», актыўнай настроенасцю на пошук у паяднанні з пастаяннай пагрозай хаосу. Для пазначэння спецыфічнай атмасферы найбольш складанага перыяду ў гісторыі сусветнай культуры У. Моранец прапанаваў увесці катэгорыю «духоўна-інтэлектуальнага стану» [4, с. 6], якая, з аднаго боку, тлумачыць падобнасць канцэптуальных пытанняў літаратурнага развіцця ў розных культурах, а з іншага – адмаўляе іх запазычанасць, «паўтарыцельнасць». У працэсе літаратурнага развіцця не існуе ідэнтычных паўтарэнняў пэўнага эстэтычнага стану, акрэсленага досведам больш развітых літаратур: кожная літаратура вызначае ўласны модус філасофскаэстэтычнага развіцця, дэтэрмінаваны спецыфічным культурна-гістарычным, генетычным, інтэлектуальным, духоўным кантэкстам, што адмыслова перажываецца дадзенай культурай у дадзены момант. Для пазначэння філасофска-інтэлектуальнай атмасферы мяжы XIX – XX стагоддзяў, аб'яднанай «агульнасцю псіхалогіі», якая заўсёды назіраецца ў людзей адной эпохі незалежна ад іншых асаблівасцей іх светаразумення, С. Венгераў прапанаваў тэрмін «неарамантызм»: «Ёсць адно імкненне некуды ўвышыню, удалечыню, углыбіню, але толькі як мага далей ад апастылай плоскасці шэрага марнатраўства, якое і дае падставы збліжаць літаратурную псіхалогію 1890 – 1910 гадоў з тымі парывамі, якія характэрныя для рамантызму. А так як шмат тут навеяна заходнееўрапейскімі новымі плынямі, то казаць патрэбна не проста пра рамантызм, але пра неарамантызм» [6, с. 34]. З рамантызмам у ранняга мадэрнізму былі асаблівыя дачыненні: найвядомейшыя плыні «канца веку» генетычна і тыпалагічна звязаны з рамантызмам, таму ў яго аснове знаходзім тэарэтычныя і мастацкія дыскурсы, распрацаваныя рамантыкамі. Гэта непрыняцце рэчаіснасці, супрацьстаўленне ёй свету мастацтва, пафас індывідуалізму, культ ірацыянальнага, схільнасць да фантастыкі, містыкі, паэтыка кантрасту і антытэзы як універсальнага арганізуючага прынцыпу і г.д. Аднак рамантызм пачатку XX стагоддзя набывае новыя вартасці, акумулюючы ў сабе досвед папярэдніх традыцый (рамантызму, рэалізму, барока, натуралізму і новых мадэрністычных тэндэнцый), таму неарамантызм мае сінтэзуючую прыроду, пра што сведчыць шэраг даследчыкаў (С. Венгераў, Д. Царык, Т. Гундарава, Л. Дарошка, Л. Скупейка).

**Асноўная частка.** Шырокае ўжыванне тэрміна «неарамантызм» у дачыненні да новых плыняў у літаратуры канца XIX – пачатку XX стагоддзя тагачаснымі і сучаснымі літаратуразнаўцамі тлумачыцца, на думку Т. Гундаравай, спробай выявіць спецыфічнасць славянскага «мадэрнізму», яго дыферэнцыянаванасць адносна класічнага канону і дыстанцыянаванасць адносна дэкадансу, які стаў філасофскай асно-

вай еўрапейскага мадэрнізму. Спецыфічны тэрмін, абраны навукоўцамі для азначэння мадэрністычных тэндэнцый у славянскіх літаратурах, падкрэслівае спецыфічнасць духоўна-інтэлектуальнай напоўненасці нацыянальнага варыянта і робіць акцэнт менавіта на рамантычнай дамінанце ў новым напрамку, што прадвызначана культурна-гістарычнымі асаблівасцямі іх развіцця: станаўленне і развіццё гэтых літаратур знаходзілася ў цеснай узаемазалежнасці з працэсамі фарміравання нацый, з развіццём нацыянальнай самасвядомасці. Таму захапленне менавіта гэтай мастацкай з'явай на мяжы XIX – XX стагоддзяў тлумачыцца цікавасцю прадстаўнікоў рамантызму да нацыянальнага духу, праблем народнасці, фальклору, народнай міфалогіі і этнаграфіі, а таксама рамантычнай ідэі свабоды асобы, мастака, што асабліва імпанавала літаратарам адраджаючыхся нацый. «Рамантычная дамінанта, – як адзначае М. Тычына, – адпавядала светаадчуванню беларускіх адраджэнцаў, у аснове якога ляжаў разлад паміж нацыянальнымі ідэаламі і сацыяльнай рэчаіснасцю, неспрыяльнай для духоўнага самавыяўлення і нацыянальна змястоўнага існавання» [9, с. 81]. Акрамя таго, рамантычная традыцыя, як слушна заўважыла Л. Тарасюк, была «мастацкай асновай спасціжэння некаторых адметных рыс беларускага менталітэту; асаблівай схільнасці да міфалагізацыі свету, да першаснапаэтычных фальклорных уяўленняў» [8, с. 38]. «Рамантызмацэнтрызм» як светапоглядная аснова канструявання мастацкага свету назіраецца ва ўкраінскай літаратуры і этнасофіі ў цэлым з характэрным для яе панэстэтызмам (эмацыйнасцю, пачуццёвасцю і лірызмам), індывідуалізмам і імкненнем да свабоды [5, с. 4].

Рамантычны пошук недасягальнага ідэалу трансфармуецца неарамантыкамі ў пошук ідэальнага сярод зямнога. Ствараючы мастацкую карціну свету, яны не адрываюцца ад рэчаіснасці і не супрацьстаўляюць ёй нейкую ідэальную прастору, увасобленую ў далёкіх, экзатычных месцах. Як слушна адзначае Д. Царык, у неарамантызме «ідэал рассеяны, параскіданы ўсюды, ён тоіцца пабач, у акаляючай чалавека рэальнасці, выдатнае, паэтычнае змешанае з несамавітым, празаічным, сусветнае праблёсквае ў бытавым, нябеснае – у зямным, у чалавеку ёсць і вечнае, і часавае, парадак развеяны ў хаосе, гармонія – у дысгармоніі. І ўсё гэта тут, паблізу, толькі далёка не заўсёды і не ўсім даступнае» [12, с. 24]. Таму неарамантыкі праяўляюць схільнасць да міфалагізацыі рэчаіснасці, фантастыкі, містыкі, якія дазваляюць увасобіць ідэальнае ў зямных формах, надаючы перакананасці, жыццёвасці створанай рэальнасці. Адбываецца зварот да міфалагічнага мыслення, да глыбіннага асэнсавання рэчаіснасці, сімвалічнага яе ўспрымання і адлюстравання, якое палягае ў абуджэнні дзеяння архетыпаў псіхікі, аднаўленні прапамяці. Як слушна заўважыла Т. Шамякіна, «асаблівасць літаратуры XX стагоддзя – у аднаўленні глыбінных міфасінкрэтычных структур мыслення, рэканструкцыі міфалагічнай свядомасці, што звязана з вяртаннем да касмалагічнага светаўспрыняцця, да неабходнасці выпрацоўкі адзінай мовы, якая магла б цэласна апісаць свет…» [13, с. 6]. Пошукі гармоніі, цэльнасці ўнутранай і вонкавай прадвызначылі зварот да вечнага, нязменнага субстрату культуры – міфа. Літаратура пачатку XX стагоддзя дае шматлікія ўзоры міфалагічнага пісьма (В. Кабылянская, В. Стэфанік, М. Кацюбінскі, М. Яцкаў, Я. Колас, Я. Купала, М. Гарэцкі, В. Ластоўскі і інш.).

Ва ўкраінскай і беларускай крытыцы для азначэння новага кірунку ў літаратуры канца XIX – пачатку XX стагоддзя найчасцей ужываліся тэрміны «новарамантызм» (Л. Украінка), «нэарамантызм» (А. Луцкевіч). Так, І. Франко ў 1904 годзе пісаў: «…Рэалізм, а нават сімвалізм і ўсе роды неарамантызму знайшлі да нас доступ» [11, с. 277]. Пад неарамантызмам крытык аб'яднаў усе нерэалістычныя плыні («роды»), у аснове якіх ляжыць суб'ектыўны пачатак, новая «душэўная арганізацыя» пісьменнікаў, «выхаваных на ўзорах найноўшай еўрапейскай літаратуры», і новая «паэтычная тэхніка». Сярод характэрных прыкмет эстэтычнай праграмы і мастацкай тэхнікі новай генерацыі ўкраінскіх пісьменнікаў І. Франко, напрыклад, вызначае «інтэрнацыяналізм», «трыумф індывідуалізму», псіхалагізм, адмаўленне «наіўнага ўтылітарызму», усякай «шаблоннасці», перанос вонкавых падзей ва «ўнутраныя, душэўныя канфлікты і катастрофы», сімвалізм, незвычайная «хваля лірызму», «несвядомая схільнасць да рытмічнасці і музыкальнасці», «вялікая сугестыўная сіла» твораў. Украінскія крытыкі (І. Франко, М. Зераў, Л. Украінка) адносяць да такіх пісьменнікаў В. Кабылянскую, В. Стэфаніка, М. Кацюбінскага, М. Яцкава.

Найбольш грунтоўна неарамантычную прыроду ранняга ўкраінскага мадэрнізму даследавала і рэалізавала ў паэзіі і драматургіі Леся Украінка. Менавіта тэрмін «новарамантызм» яна ўжывае найчасцей, пазначаючы новыя літаратурныя плыні або тэндэнцыі, у аснове якіх ляжыць ідэя свабоды асобы і творчасці, яе няспыннага развіцця і ўдасканалення, прыкладам чаго стала творчасць «непаслядоўнага» Г. Гауптмана, які «задаў тон нямецкай новарамантыцы» [10, с. 134]. У артыкуле «Маларускія пісьменнікі на Букавіне» сярод безумоўных вартасцей твораў В. Кабылянскай вызначана стварэнне ёю моцных духам, цэльных, самабытных натур, здольных да парываў «ins Blau» [10, с. 72], якія таксама з'яўляюцца ўвасабленнем «новарамантычнай вызваленчай ідэі», здольнасці асобы, творцы быць свабодным, верным сабе, велічы свайго духа [10, с. 237]. Аналізуючы польскую літаратуру канца XIX – пачатку XX стагоддзя, а таксама зборнік С. Пшыбышэўскага, які лічыцца маніфестам польскіх мадэрністаў, Л. Украінка ўказвала на шматлікія «супадзенні» канцэптуальных рыс праграмы польскай «хворай мадэрны» з версіямі французскай *décadence* і нямецкай *Modern*, хоць і заўважала, што «пад усімі гэтымі трагічнымі

маскамі, створанымі касмапалітычнай сусветнай тугою, адчуваецца іншае аблічча, з чыста польскімі рысамі, аблічча вар'ята-імправізатара Густава, героя палымяных галюцынацый Міцкевіча, толькі яшчэ больш бледнае, з паглядам, які спыніўся ад жаху перад зданямі…» [10, с. 113]. «Абсалютная свабода мастацтва», якую дэклараваў філосаф у сваім скандальным трактаце «Confiteur», адмаўляла мастацтва тэндэнцыйнае, патрыятычнае, грамадскае, дэмакратычнае, народнае і г.д., што рабіла яго пазіцыю для ўкраінскага пісьменства канца XIX стагоддзя непрымальнай. Леся Украінка таксама заўважыла яе «слабасці», якія стваралі «адкрытае мора супярэчнасцей яго тэорыі», хоць па вонкавай манеры характар стылю філосафа-дэкадэнта, на яе думку, мае новарамантычны характар, бо «нацыянальнае пытанне заўсёды займала першае месца ў польскай літаратуры», і нават мадэрнізм стаў своеасаблівай праявай страху пісьменства «за нацыянальнае існаванне, якое пазбаўляецца падтрымкі векавых асноў у выглядзе гістарычных і рэлігійных традыцый» [10, с. 111]. Польскі мадэрнізм не адмяняў нацыянальнай праблематыкі, але яму бракавала «свабоды духу, адвагі», якія актыўна культываваліся ў украінскай літаратуры канца XIX – пачатку XX стагоддзя і якіх так не хапала «багатай, шматстайнай і вельмі цікавай польскай літаратуры» [10, с. 127].

У кантэксце неарамантычнага светапогляду Л. Украінкі па-новаму асэнсоўваюцца такія паняцці, як «народ», «народнасць», «нацыя», «нацыянальнасць», «патрыятызм». Яна заўсёды выступала супраць тэндэнцыйнага, прымітыўнага адлюстравання народа, характэрнага народніцкай літаратуры, таму ёй асабліва імпанаваў стыль В. Стэфаніка (артыкул «Маларускія пісьменнікі на Букавіне»): «Г. Стэфанік – не народнік; яго "народ" не з'яўляецца носьбітам якіх-колечы "асноў" і дабрачыннасцяў, невядомых "гнілой інтэлігенцыі", але менавіта адсутнасць гэтых асноў і дабрачыннасцей, раскрытае ўмелай і пяшчотнай рукой, стварае на думаючых... чытачоў больш моцнае, больш глыбокае і больш плённае ўражанне, чым усе, пранікнёныя, канечне, найлепшымі намерамі, панегірыкі ідэалізаванаму народу ў народніцкай літаратуры» [10, с. 74]. Леся Украінка захапляецца глыбінёю разумення пісьменнікам асноў народнага жыцця, яго ўнутранай існасці, што прадвызначыла фармаванне мадэрністычнай інтэрпрэтацыі паняцця «народная паэзія». Так, у артыкуле «Два напрамкі ў навейшай італьянскай літаратуры» яна закранае праблему сутнасці народнай паэзіі: «Аду Нэгрі часта называюць народнай паэтэсай, і калі разумець пад словам "народ" рабочыя класы, а народным паэтам лічыць таго, хто апявае жыццё і выражае імкненні гэтых класаў, то такое вызначэнне цалкам дакладнае ў адносінах да Ады Нэгрі. Калі ж народным паэтам называць таго, хто засвоіў не толькі ідэі, але і саму форму народнай паэзіі, то такое вызначэнне зусім не падыходзіць да гэтай паэтэсы» [10, с. 31]. Такім чынам, права называцца сапраўды народным паэтам, паводле канцэпцыі Л. Украінкі, мае той, хто змог, найперш, праняцца духам народа, спасцігнуць аснову «народнага духу». Л. Дарошка слушна заўважыла: «"Народны паэт" у разуменні Лесі Украінкі той, хто дакрануўся да лячэбных і выратавальных глыбінь народных, выбраў "шлях усярэдзіну". "Шлях усярэдзіну" ёсць адзін з універсальных шляхоў мастацтва. Для Лесі Украінкі ён з'яўляецца яе своеасаблівай рэлігіяй і творчым метадам» [2, с. 33].

Такім чынам, канцэпцыя неарамантычнай творчасці, распрацаваная Л. Украінкай, разумела істотную змену найперш філасофска-светапоглядных арыенціраў у айчыннай літаратуры, якая павінна грунтавацца на ідэі свабоды творчасці, сувярэннасці і тэургійнай сіле мастацтва, на ідэі свабоды самавыяўлення мастака, унутранай і вонкавай незалежнасці асобы, якая знаходзіць гармонію ў самарэалізацыі духоўна-інтэлектуальнай і грамадскай, а таксама на ідэі народа як супольнасці свабодных, самадастатковых асоб.

У літаратурна-крытычных артыкулах А. Луцкевіча «нэарамантызм» – агульная назва новых плыняў у беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя [3, с. 126]. Ён заўважыў, што ў беларускай літаратуры «нашаніўскага» перыяду «дужа добра ўжываліся побач прадстаўнікі народніцкага натуралізму і рамантызму, рацыяналізму і містыцызму, пралетарскай барацьбы і эстэтызму, канчаючы разнароднымі плынямі нэарамантызму» [3, с. 256]. Пры гэтым беларускі крытык пад «разнароднымі плынямі нэарамантызму» разумее названыя вышэй рамантызм (Я. Купала), містыцызм (М. Гарэцкі, З. Бядуля), эстэтызм (М. Багдановіч) з адрозненнем у іх індывідуальна-асобасных мадыфікацыях. А. Луцкевіч, называючы прадстаўнікамі неарамантызму Я. Купалу, Я. Коласа і М. Багдановіча, вылучае адну з адметнасцей кірунку – пераемнасць, адсутнасць антытрадыцыйнай скіраванасці, характэрнай для плыняў 20-х гадоў XX стагоддзя. Указваючы на яго сувязь з польскім і рускім мадэрнізмам, а таксама на тое, што яго прадстаўнікі выхоўваліся на лепшых узорах еўрапейскай літаратурнай класікі, ён падкрэслівае нацыянальна-спецыфічны каларыт беларускага варыянта (фалькލорны містыцызм у спалучэнні з еўрапейскім эстэтызмам), які абумоўлены адметным светаўспрыманнем: «Яны [тут Я. Колас, Я. Купала, М. Багдановіч], праўда, чуюць па-своему, «па-народнаму», але свае думкі і пачуцьці высказваюць агульнай для ўсіх «эўрапейцаў» мовай. Сваё, народнае яны прапускаюць праз нівелюючую прызму агульнаеўрапейскае цывілізацыі. І праз рамантызм і рэалізм яны разам з усёй эўрапейскай паэзіяй даходзяць урэшце да тых новых кірункаў, якія маюць агульнае імя «нэарамантызму»: сымбалізму, мадэрнізму і г.д.» [3, с. 126]. «Нэарамантызм», паводле інтэрпрэтацыі А. Луцкевіча, увасабляе сабой нацыянальны варыянт ранняга беларускага мадэрнізму, у якім рэалізуецца імкненне найноўшай літаратуры «ў вышу – да шырокіх кругазораў адарванай

мысьлі і красы, да містыцызму (М. Гарэцкі, З. Бядуля), да захаплення “чыстай красой парываў чалавечай душы” (“Мадонна” М. Багдановіча, “Малітва малога Габрусіка” З. Бядулі), красой прыроды (усе без выключэння), красой формы і слова», неаддзельных ад імкнення да актыўнай нацыятворчасці [3, с. 90]. Культываванне агульначалавечых і нацыянальных ідэалаў, дасканаласць і багацце форм, «сіла экспрэсіі» складаюць аснову новага кірунку.

Крытык адзначае нараджэнне ў беларускай літаратуры «новага беларуса», які ўспрымаецца не толькі як эквівалент селяніна, вылучаецца не толькі нацыянальнай, сацыяльнай пазіцыяй, а вызначаецца іншымі крытэрыямі – новым светаадчуваннем, якое мае ўжо прыкметы «сучаснага нэрвовага, зь незвычайна зложанай псыхічнай арганізацыяй, “цывілізаванага” эўрапейца» [3, с. 125], «імкненне да вызвалення ў беларусе – Чалавека» [3, с. 258]. Неарамантычная канцэптуалізацыя асобы непарыўна звязана з ідэяй вызвалення, якая спалучае «еўрапейскія» рысы бунтуючай, складанай асобы, што імкнецца да ўнутранай свабоды, і «перыферыйныя» рысы нацыянальна вызначанай асобы з выразнай грамадскай пазіцыяй, што імкнецца да ўзрастання ў сабе пачуцця нацыянальнай і асабістай годнасці, незалежнасці. Гэтая, на першы погляд, парадаксальная асаблівасць (злучанасць народніцкіх ідэалаў з мадэрнісцкай эстэтыкай) абумоўлена тым, што развіццё беларускага мадэрнізму (неарамантызму) супала з моцнай хваляй нацыянальнага самаўсведамлення і з пачаткам распрацоўкі нацыянальнай ідэі ў беларускім грамадстве. Развіццё новай беларускай літаратуры А. Луцкевіч бачыў менавіта ў кантэксце спалучэння ідэі красы і свабоды: «...працай творчай і адчуваннем красы яны здолеюць знайсьці тую лінію разьвіцця, якая, не абніжаючы іх твораў з мастацкага боку, будзе найбольш, найпэўней адпавядаць новым настроям і новым імкненням “новага беларуса”» [3, с. 132].

Такім чынам, неарамантызм у славянскіх літаратурах паўстае ў шматлікіх інтэрпрэтацыях: то як з’ява «пераходнага перыяду» – ад рэалізму да мадэрнізму, то як «неарамантычная эпоха», вызначаная асаблівым філасофска-псіхалагічным станам свядомасці чалавецтва, то як літаратурная плынь канца XIX – пачатку XX стагоддзя разам з сімвалізмам, дэкадансам, імпрэсіянізмам, мадэрнізмам, то як умоўная назва сукупнасці ўсіх новых плыняў мяжы стагоддзяў, якія фарміраваліся ва ўмовах апазіцыі пазітывістцкай філасофіі і абапіраліся на прынцыпы рамантычнай эстэтыкі і г.д. У распрацоўцы неарамантычнай канцэпцыі творчасці, акрэсленай Л. Украінкай ва ўкраінскай і А. Луцкевічам у беларускай літаратурах, назіраецца тыпалагічная падобнасць ідэйных асноў, на якія абапіраецца новая для абодвух культур літаратурная плынь. Грунтуецца неарамантызм, паводле крытыкаў, на ідэі паяднання агульначалавечага з нацыянальным, асобаснага з грамадскім і засваенні лепшых узораў сучаснай еўрапейскай літаратуры, яе філасофска-эстэтычнай асновы дзеля ўзрастання інтэлектуальнага ўзроўню свядомасці, удасканалення мастацка-эстэтычнага боку айчыннай літаратуры. Галоўнай, «родавай» прыкметай неарамантызму, якая адрознівае яго ад іншых літаратурных плыняў, і найперш ад мадэрнізму, паводле Л. Скупейка, з’яўляецца «новае разуменне чалавека як “суверэннай асобы”» [7; 8]. Таму значнае месца ў літаратурна-крытычных артыкулах Л. Украінкі і А. Луцкевіча займае таксама канцэптуалізацыя неарамантычнага героя. Яму характэрны духоўны дынамізм, унутраная актыўнасць, імкненне да свабоды, самарэалізацыі асобаснай і грамадскай.

**Вывады.** Украінская і беларуская літаратуры на пачатку XX стагоддзя развіваліся ў рэчышчы агульнаеўрапейскага працэсу: маладыя літаратуры, у імкненні быць сучаснымі, адэкватнымі духу часу, вырашаючы пытанні шляхоў і напрамкаў нацыянальна-культурнага самавызначэння, актуалізуюць праблему «еўрапеізацыі – нацыянальнай дыферэнцыяцыі». Пад «еўрапеізацыяй» і «мадэрнізацыяй» разумелася арыентацыя на Еўропу пры адначасовым уліку ўласных эстэтычных патрэб, трансфармацыі яе мастацкага досведу згодна ўласнай нацыянальнай спецыфіцы. Таму ва ўкраінскай і беларускай літаратурах для пазначэння новага напрамку, які аб’яднаў усе нерэалістычныя плыні, у аснове якіх ляжыць суб’ектыўны пачатак, крытыкамі (І. Франко, М. Зеравым, Л. Украінкай, А. Луцкевічам) найчасцей ужываецца тэрмін «неарамантызм», які падкрэсліваў яго традыцыйную скіраванасць, апелятыўнасць да рамантычнага тыпу мыслення ў паяднанні з асваеннем заходнееўрапейскага мадэрнізму.

Найбольш грунтоўна ідэйна-эстэтычныя асновы ўкраінскага неарамантызму ў сваіх літаратурна-крытычных артыкулах вызначыла Л. Украінка. Разглядаючы новы напрамак у айчыннай літаратуры ў кантэксце агульнаеўрапейскага літаратурнага працэсу, яна вылучае сярод сімптаматычных яго прыкмет наступныя:

- ідэя свабоды асобы, стварэнне моцных духам герояў, якія становяцца ўвасабленнем «новарамантычнай вызваленчай ідэі»;
- ідэя суверэннасці мастацтва і яго тэургійнай сілы, свабоды самавыяўлення мастака;
- пераасэнсаванне паняццяў «народ», «народная паэзія», якое перадбачае змену ракурсу бачання народа з ідэалістычна-народніцкага вобразу прымітыўнага сялянства да ўспрымання яго як супольнасці самадастатковых асоб;
- актуальнасць нацыянальнай праблематыкі;
- сінтэтызм як вызначальны творчы метад, які акумулюе ў сабе досвед папярэдніх традыцый (рамантызм, рэалізм, натуралізм, мадэрнізм і г.д.).

У літаратурна-крытычных артыкулах А. Луцкевіча неарамантызм выступае як агульная назва мадэрністычных плыней або тэндэнцый, якія праявіліся ў беларускай літаратуры на пачатку XX стагоддзя. Падкрэсліваючы шматстайнасць яго мастацкіх рэалізацый у айчыннай літаратуры (у эстэтызме М. Багдановіча, містыцызме З. Бядулі і М. Гарэцкага, рамантызме Я. Купалы і г.д.), ён вылучае галоўную рысу напрамку – яго пераемнасць, апору на рамантычную традыцыю, якая ў беларускай літаратуры была яшчэ далёкай ад стадыі вычарпанасці. Паяднoўваючы ў сабе рамантычна-фальклорную, міфалагічна-містычную стыхію і новае светаадчуванне, народніцкія ідэалы з мадэрністычнай эстэтыкай (індывідуалізмам, суб'ектывізмам), неарамантызм у інтэрпрэтацыі А. Луцкевіча становіцца нацыянальным варыянтам ранняга беларускага мадэрнізму.

ЛІТАРАТУРА

1. Гундорова, Т. ПроЯвлення Слова: Дискурсія українського модернізму. Постмодерна інтерпретація / Т. Гундорова. – Львів, 1997. – 298 с.
2. Дорошко, Л.С. Неоромантична природа раннього українського модернізму: моногр. / Л.С. Дорошко; Брест. гос. ун-т им. О.С. Пушкина. – Брест: Изд-во БрДУ, 2007. – 191 с.
3. Луцкевіч, А. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва / А. Луцкевіч. – Мінск, 2006. – 460 с.
4. Моренець, В. Національні шляхи поетичного модерну першої половини XX ст.: Україна і Польща / В. Моренець. – Київ: Вид-во Соломії Павличко «Основи», 2002. – 327 с.
5. Пригодій, С. Літературний імпресіонізм в Україні та США: Типологія та національні особливості / С. Пригодій. – Київ, 1998. – 312 с.
6. Русская литература XX века (1890 – 1910): в 2 кн. / под ред. проф. С.А. Венгерова. – М.: Издат. Дом «XXI век – Согласие», 2000. – Кн. 1. – 512 с.
7. Скупейко, Л.І. Неоромантизм Лесі Українки (Рецепція. Концепція особистості. Міфопоетика): автореф. дис. … д-ра філол. наук / Л.І. Скупейко. – Київ, 2009. – 40 с.
8. Тарасюк, Л. Рамантызм у беларускай літаратуры / Л. Тарасюк // Роднае слова. – 1998. – № 9. – С. 37 – 43.
9. Тычына, М.А. Феномен пераходнага перыяду: праблема тыпалогіі / М.А. Тычына // Літаратура пераходнага перыяду: тэарэт. асновы гіст.-літ. працэсу. – Мінск, 2007. – С. 3 – 101.
10. Українка, Л. Зібрання творів: у 12 т. – Київ: «Наукова думка», 1977. – Т. 8. – 320 с.
11. Франко, І.Я. Краса і секрети творчості / І.Я. Франко; упор., приміт. Р.Т. Гром'яка. – Київ, 1980. – 444 с.
12. Царик, Д.К. Типология неоромантизма / Д.К. Царик; отв. ред. Л.С. Радек. – Киев: Штиинца, 1984. – 166 с.
13. Шамякіна, Т.І. Беларуская класічная літаратура і міфалогія / Т.І. Шамякіна. – Мінск: БДУ, 2001. – 186 с.

*Паступіў 29.10.2010*

**CONCEPTUALIZATION OF THE NEOROMANTICISM IN UKRAINIAN AND BELORUSSIAN LITERATURES OF THE BEGINNING OF THE XX CENTURY**

***I. VORON***

*The article deals with neoromanticism as an artistic and aesthetic movement, which reproduced the philosophical and psychological atmosphere of the end of the XIX$^{th}$ and the beginning of the XX$^{th}$ century in Slavic culture. Greater resort to the term "neoromanticism" by Ukrainian and Belarussian critics is explained by their attempt to emphasize the peculiarity of Slavic modernism, to pay attention to its romantic component, and to its singularity in context of classical West European modernism, to dissociate it from decadence, negatively evaluated in these literatures. The conceptualization of the Ukrainian neoromanticism is expressively reproduced in literary and critical articles by Lesya Ukrainka. They analyse the origin and the nature of the above mentioned literary movements, consider their general tendencies within the European literary process, and the peculiarities of the way they are displayed in Ukrainian literature. Anton Lutskevich defines neoromanticism as a general name for Belarussian literary modernistic movements and marks out traditionality as its main trait. Conceptualization of neoromantic hero is also an important topic in the literary and critical articles by Lesya Ukrainka and Anton Lutskevich.*